# ІНСТЫТУТ ІНКЛЮЗІЎНАЙ АДУКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Інклюзіўная адукацыя

Гэта сусветная тэндэнцыя развіцця агульнай адукацыі, якая прадугледжвае ўключэнне ўсіх дзяцей незалежна ад існуючых паміж імі адрозненняў (у тым ліку дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця) у адзіны адукацыйны працэс. Ідэя інклюзіі нарадзілася ў рамках маштабных зменаў у разуменні правоў чалавека, яго годнасці, ідэнтычнасці. Яна прадугледжвае гнуткую трансфармацыю адукацыйнай сістэмы ў адпаведнасці з індывідуальнымі патрэбамі, пазнавальнымі магчымасцямі і здольнасцямі кожнага дзіцяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Дзейнасць

Інстытут інклюзіўнай адукацыі ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў на I ступені вышэйшай адукацыі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі па спецыяльнасцях: «Алігафрэнапедагогіка», «Тыфлапедагогіка», «Сурдапедагогіка», «Лагапедыя», на II ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) па наступных спецыяльнасцях:

Карэкцыйная педагогіка;

Карэкцыйная педагогіка з прафілізацыяй «Ранняя комплексная дапамога дзецям з адхіленнямі ў развіцці» (у сеткавай форме);

Карэкцыйная педагогіка з прафілізацыяй «Дзейнасць псіхолага-медыка-педагагічнай камісіі і псіхолага-медыка-педагагічнага кансіліума» (у сеткавай форме).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Адміністрацыя
# Інстытут інклюзіўнай адукацыі

**Хітрук Вера Валер'еўна** - дырэктар Інстытута інклюзіўнай адукацыі, доктар педагагічных навук, дацэнт;
**Ваўчанкоў Уладзімір Сцяпанавіч** - намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, кандыдат псіхалагічных навук;
**Фяклістава Святлана Мікалаеўна** - намеснік дырэктара па навукова-метадычнай рабоце, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
**Макрацова Валянціна Міхайлаўна** - намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце;
**Турскі Баляслаў Тадэвушавіч** - начальнік вучэбна-арганізацыйнага аддзела.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ